# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА Ў ШКОЛЕ

3'89

**300 гадоў з дня смерці Казіміра Лышчынскага**

**Валерый БОЛБАС**

# Настаўнік беларускіх атэістаў

Другая палавіна XVII ст. для Беларусі была тым перыядам, калі гісторыя нібы часова павярнулася назад. Даследчыкі справядліва называюць гэты час цемрашальскім, змрочным у нашай гісторыі. Пасля паражэння ў выніку рэфармацыі ў Заходняй Еўропе каталіцкая царква актывізавала сваю дзейнасць на беларускіх землях, імкнулася ўстанавіць пануючае становішча ў духоўным і сацыяльным жыцці грамадства. Дзейсным правадніком ідэй контррэфармацыі выступаў ордэн езуітаў, што меў на Беларусі разгалінаваную сетку кляштараў і школ. Трэба адзначыць, што езуіты дасягнулі значных поспехаў, бо мелі на той час добра прадуманую і адладжаную сістэму бясплатнай адукацыі. Развіццё езуіцкіх школ суправаджалася закрыццём прагрэсіўных брацкіх. Яшчэ больш паглыбіўся працэс дэнацыяналізацыі. Беларусь, якая мела слаўныя традыцыі кнігадрукавання, адчувала востры кніжны голад. Рынак быў перапоўнены багаслоўскай літаратурай. Аднак духоўны ўплыў падзей эпохі Адраджэння і Рэфармацыі ўжо нельга было знішчыць. Нягледзячы на неспрыяльныя гістарычныя ўмовы, духоўнае жыццё не спынялася, час ад часу заяўляла аб сабе яскравымі падзеямі, выдатнымі асобамі, да якіх адносіцца Лышчынскі.

Казімір Лышчынскі нарадзіўся 4 сакавіка 1634 г. у маёнтку Лышчыцы Брэсцкага павета. Небагатаму старадаўняму шляхецкаму роду Карчакоў-Лышчынскіх на той час належалі, апроч Лышчыцаў, двары Дабраніж, Кустынь і Матыкалы. Бацька будучага атэіста Еранім Казімір даў яму, самаму здольнаму з чатырох сыноў, добрую адукацыю. Ён скончыў Брэсцкую езуіцкую калегію (так называлі каталіцкую сярэднюю школу). У калегіі прымалі дзяцей з багатых радавітых сем'яў і заможных шляхцічаў. Усё навучанне падпарадкоўвалася багаслоўю з мэтай выхавання ў вучняў рабскай адданасці «Таварыству Ісуса», рэлігійнаму фанатызму, пагарды да ўсяго новага, прагрэсіўнага.

Затым К. Лышчынскі працягваў далейшую адукацыю ў езуіцкіх установах Кракава, Каліша і Львова. У 24-х гадовым узросце ўступіў у езуіцкі ордэн.

Як выхаванец і член ордэна працаваў выкладчыкам, пазней — памочнікам рэктара Брэсцкай езуіцкай калегіі. Погляды маладога педагога прынцыпова адрозніваліся ад таго, што выкладалася ў школе. Ён выйшаў з ордэна з-за нязгоды з мэтамі і задачамі адукацыі ў каталіцкіх навучальных установах, пасяліўся ў 1666 г. у родным маёнтку, ажаніўся і заняўся актыўнай свецкай дзейнасцю.

Энергічны, эрудыраваны, здольны арганізатар, ён хутка заваяваў аўтарытэт сярод тутэйшай шляхты, якая потым неаднаразова выбірала яго паслом ад Брэсцкага ваяводства на сейм. На адным з брэсцкіх павятовых сеймаў Лышчынскага «з усеагульнага ўхвалення шляхты» выбралі падсудкам брэсцкага земскага суда, і ён быў зацверджаны на гэтай пасадзе каралём.

Будучы прыхільнікам ідэі асветніцтва, ён у сваім маёнтку адкрыў школу, у якой сам выкладаў мовы і асновы розных навук. У ёй вучыліся хлопчыкі і дзяўчынкі — дзеці тутэйшай шляхты і нават сялян. Усё гэта надавала ёй глыбокі дэмакратычны характар і рабіла яе не падобнай ні на адну тамашнюю школу таго часу. На жаль, да нашых дзён не знойдзены дакументы, якія раскрывалі б гэты бок дзейнасці К. Лышчынскага.

---

**Валерый Сяргеевіч Болбас** — выкладчык Акцябрскага СПТВ № 181 (г. п. Акцябрскі Гомельскай вобл.).

Аб змесце навучання і выхавання ў яго школе можна меркаваць па тым, што ён на пачатку заняткаў зняў у сваёй школе табліцу, на якой было напісана хоць і язычніцкім пісьменнікам, але з думкай пра бога па-хрысціянску: «Калі сярод філосафаў падымаецца пытанне аб вывучэнні прыроды багоў, то лепш за ўсё прызнаць, што мы аб гэтым нічога не ведаем» (3. С. 132). Лышчынскага не задаволіў змест таблічкі, хоць там і былі сумненні наконт існавання бога. Як вядома з гісторыі, аўтар радкоў гэтай таблічкі старажытнагрэчаскі сафіст Пратагор ужо нават за такое сумненне быў абвінавачаны ў бязбожжы, хаця сам і не быў атэістам.

Педагог-мысліцель, які быў глыбока перакананы ў сваіх атэістычных поглядах, не дапускаў нават ніякага сумнення адносна неабходнасці безрэлігійнага выхавання вучняў. У яго школе не маглі існаваць каталіцка-езуіцкія прынцыпы выхавання, бо ставілася задача свецкага маральнага выхавання чалавека, развіцця яго творчых здольнасцей. Вызваляючы мараль ад путаў рэлігіі, Лышчынскі ў сваёй школе сцвярджаў думку аб духоўнай свабодзе чалавека, рэгулятарам паводзін якога павінны быць не рэлігійныя правілы, а розум і сумленне. Лышчынскі і сам служыў добрым прыкладам для сваіх вучняў. На пасяджэннях суда ён абараняў бедных сялян, у многіх працэсах выносіў рашэнні не на карысць езуітаў. Груба парушыўшы царкоўныя каноны, выдаў сваю дачку замуж за каханага, шлюб з якім, з нагоды блізкага сваяцтва забараняўся. За такі грэх яго адлучылі ад царквы. У яго школе панавалі гуманістычныя ідэі. У якасці галоўнай каштоўнасці аб'яўляўся чалавек і вартасць яго асобы, маральныя якасці якой не дадзены аднекуль зверху, а ствараюцца ў натуральнай жыццёвай практыцы, і выхаванне пры гэтым адыгрывае рашаючую ролю.

Погляды беларускага атэіста фарміраваліся яшчэ ў часе навучання ў калегіі, дзе часта задаваў «грэшныя» пытанні, выказваў парадаксальныя меркаванні пра бога, анёлаў і рэлігію. Юнака за такія погляды каралі, адказваючы яму ў школьных прывілеях і забеспячэнні. Аднак гэта не спыняла яго, і ён выказваў свае думкі іншым, але патаемна.

Пасля выхаду з езуіцкага ордэна Лышчынскі ўзяўся за вывучэнне літаратуры, права, тэалогіі і філасофіі. Ён імкнуўся сам знайсці адказы на хвалюючыя яго сацыяльныя і духоўныя пытанні. І чым глыбей займаўся антычнай філасофіяй, сучаснай літаратурай, у тым ліку і забароненай, тым больш умацоўвалася вера ў хлуслівасці рэлігійнага тлумачэння рэчаіснасці. Даследуючы ўсе даступныя яму крыніцы, К. Лышчынскі зрабіў бескампрамісны, катэгарычны вынік: «Выходзіць, бога няма». (3. С. 134).

Варта адзначыць, што нават ніхто з мысліцеляў эпохі Адраджэння не ўзняўся да ўзроўню адмаўлення бога наогул, а таму такая выснова Лышчынскага ўяўляла сабой новы рэвалюцыйны ўзлёт думкі.

Усе свае атэістычныя ідэі і вывады доказна і аргументавана Лышчынскі выклаў у трактаце «Аб неіснаванні бога», што напісаны на 265 лістах у традыцыйнай тады форме пытанняў і адказаў веруючага і атэіста.

Езуіты, безумоўна, не маглі дараваць такой здрады «ўцекачу з ордэна». У 1687 г. 15 сшыткаў рукапіснага трактата ўкраў яго сусед Ян Бжоскі і данёс віленскаму епіскапу, які дабіўся зняволення крамольнага аўтара.

Пасля некалькіх тыдняў судовага разгляду, дзякуючы намаганням епіскапаў, ерэтыку вынеслі смяротны прыгавор: «Лышчынскі павінны быць вывезены за горад і спалены на кастры разам са сваімі творамі ў руках. Маёмасць яго будзе канфіскавана, дом, у якім ён жыў, разбураны, і месца пакінута пустыром на вечныя часы» (3. С. 130).

Цяпер у распараджэнні даследчыкаў вельмі мала крыніц, якія раскрываюць веліч духоўнага і грамадзянскага подзвігу настаўніка і мысліцеля. Да нас дайшлі частка матэрыялаў следства, выказванні пра яго прадстаўнікоў духавенства, вынікі вывучэння жыцця і дзейнасці Лышчынскага нямецкім гісторыкам XVIII ст. Г. Сейлерам і інш. Каштоўнай стала знаходка польскім гісторыкам А. Навіцкім у 1957 г. пяці фрагментаў з трактата «Аб неіснаванні бога». Галоўная думка гэтай часткі — «Чалавек — стваральнік бога, а бог — тварэнне і стварэнне чалавека» (3. С. 133). З'яўляючыся перакананым носьбітам поглядаў стыхійнага матэрыялізму, К. Лышчынскі не прызнаваў існавання ў прыродзе любых звышнатуральных сіл. Адмаўляючы наяўнасць таго свету, мысліцель замахнуўся на адзін з галоўных пастулатаў тэалогаў — бессмяротнасць душы. Паводле абвінавачванняў ён не верыў ні ў рай, ні ў пекла, параўноўваў душы людзей з душамі жывёл. У гэтым кірунку, як слушна адзначыў В. Шалькевіч, Лышчынскі апярэдзіў славутага філосафа Вальтэра (9. С. 224). Важна адзначыць, што ён выступаў не толькі супраць каталіцкага веравучэння, а ўвогуле супраць любой рэлігіі. У сваёй лагічнай паслядоўнасці ён зрабіў вывад, што «рэлігія ўстаноўлена людзьмі няверуючымі, каб іх саміх ушаноўвалі...» (5. С. 286). Ён бачыў у грамадстве наяўнасць людзей, якія зацікаўлены ў рэлігійным падмане народа. Варта тут напомніць, што пры

жыцці Лышчынскі падрыхтаваў сабе надмагільны надпіс: «О, падарожны! Не праходзь міма гэтых камянёў. Ты на іх не спатыкнешся, калі не спатыкнешся на ісціне. Пазнаеш ісціну каля камянёў: бо нават тыя людзі, якія ведаюць, што гэта праўда, вучаць, што гэта хлусня. Вучэнне мудрацоў — свядомы падман» (3. С. 134). Яго здагадка знойдзе пасля рэальнае навукова-тэарэтычнае ўвасабленне ў распрацоўках класікаў марксізму-ленінізму. Успомнім вядомы выраз К. Маркса: «Рэлігія ёсць опіум для народа» (1. С. 415).

На судовым пасяджэнні Лышчынскага абвінавачвалі ў тым, што ён жадаў «мецць свет без улады, гарады без начальнікаў, народы без цароў...» (3. С. 132). З гэтага можна ўявіць сацыяльна-палітычныя погляды вольнадумнага настаўніка. Тут заўважаецца яго мара аб справядлівым, дэмакратычным грамадскім ладзе, у аснове якога ляжыць грамадзянская і духоўная свабода асобы, таму невыпадкова Лышчынскага адносяць да ліку першых беларускіх сацыялістаў-утапістаў.

Зразумела, што ў тых умовах ён не мог узняцца вышэй за ідэі Асветніцтва і заставаўся на пазіцыях стыхійнага матэрыялізму. Каб адзначыць ролю Лышчынскага ў развіцці грамадскай думкі, варта прыгадаць выказванне У. І. Леніна, што «аб гістарычных заслугах судзяць не па тым, чаго *не далі* гістарычныя дзеячы ў параўнанні з сучаснымі патрабаваннямі, а па тым, што яны *далі новага* параўнальна са сваімі папярэднікамі» (2. С. 178).

У сваім свецкім жыцці Лышчынскі, асабліва пасля выбрання падсудкам брэсцкага земскага суда (гэта ў нейкай ступені абараняла яго ад праследаванняў езуітаў), у дыспутах і спрэчках вёў адкрытую атэістычную прапаганду. І рабіў гэта паспяхова, што і адзначалася на судзе: «Лышчынскі пачаў яўна заражаць гэтай навукай, як ядавітай атравай, нявінныя розумы маладых і дарослых людзей...» (3. С. 132).

Служкі культу імкнуліся дзёрзкае вольнадумства і атэізм Лышчынскага паказаць выпадковай з'явай, ніякім чынам не звязанай з тым асяроддзем, у якім ён жыў. Безумоўна, светапогляд Лышчынскага фарміраваўся пад уздзеяннем антычных філосафаў, дзеячаў эпохі Адраджэння. Аднак і ў самой Беларусі элементы матэрыялістычна-атэістычнага вучэння яўна прасочваюцца ўжо з XV ст. Гуманістычныя ідэі Францішка Скарыны перараслі ў скрытую апазіцыйнасць царкве Сымона Буднага і выліваліся ў адкрыта варожыя адносіны да рэлігіі ў Стэфана Лована (Яна Лавейкі).

Езуіты добра разумелі, што ідэі «першага настаўніка атэістаў» могуць авалодаць думкамі людзей, а таму гэта палохала іх больш за ўсё. Яны лічылі, што злачынства Лышчынскага «пераўзыходзіць усе, якія ёсць на свеце. Бо меншымі з'яўляюцца... забойствы бацькі, маці, брата, дзіцяці...».

Само імя Лышчынскага прыводзіла царкоўнікаў у ярасць. Нават адрачэнне яго ад свайго вучэння, каб выратаваць сваё жыццё, не дапамагло яму. Каб і пасля смерці мысліцеля нічога не засталося ад яго і нічога аб ім не напамінала, попел пасля спальвання яго трупа змясцілі ў снарад і выстралілі з гарматы. Аднак можна забіць чалавека і знішчыць яго працу, але нельга забіць ідэю. Пасля пакарання атэіста багаслоў Пётр Грэк з жахам пісаў: «Ён падарваў асновы рымска-каталіцкай веры» (8. С. 135). Зярняты атэізму, пасеяныя Лышчынскім у XVII ст., далі дружныя ўсходы ў XVIII ст. і ў пазнейшы час. Стаў набіраць сілу працэс развіцця свецкай культуры.

Беларускага мысліцеля-атэіста, матэрыяліста і педагога не без падстаў параўноўваюць з вядомымі італьянскімі атэістамі Лючылiё Ваніні і Джардана Бруно. Дзякуючы смеласці, глыбіні і шырыні думкі, паслядоўнасці яго поглядаў, сацыяльнага накірунку, значэнне яго філасофскай і педагагічнай спадчыны выходзіць за межы Беларусі і займае адно з пачэсных месцаў у гісторыі сусветнага атэістычнага руху.

Памяць беларускага народа аб сваім настаўніку атэістаў жыве разам з яго вучэннем. Імя Лышчынскага з'яўляецца гонарам не толькі нашага народа, але польскага і літоўскага. Яго спадчыну вывучалі і вывучаюць французскія, англійскія, шведскія і італьянскія вучоныя.

1. Маркс К. К критике гегелевской философии права. Введение // Маркс К. и Энгельс Ф. Соч. Т. 1. Изд. 2-е. М., 1955. С. 415.
2. Ленин В. И. К характеристике экономического романтизма // ПСС. Т. 2. Изд. 5-е. М., 1958. С. 178.
3. Антология педагогической мысли Белорусской ССР. М., 1986.
4. Друшчыц В. Казімір Лышчынскі — бязбожнік XVII веку // Полымя, 1927. № 2.
5. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Мн., 1962. С. 270—304.
6. Из истории свободомыслия и атеизма Белоруссии. Мн., 1978.
7. Лыщинский Л. Род дворян Лыщинских. СПб., 1907.
8. Мараш Я. Змагар супраць цемрашальства // Маладосць. 1961. № 7. С. 134—136.
9. Шалькевіч Вячаслаў. Касцёр бессмяротнасці // Полымя. 1977. № 3. С. 220—226.